ШАНУЙ СВАЁ

НАШЫ ПРАЕКТЫ ПРЫЕМНА ЗДЗІЎЛЯЮЦЬ ГАСЦЕЙ

Існуе мноства фактараў, што фарміруюць згуртаванае грамадства, сярод якіх істотнымі з'яўляюцца культурная спадчына нацыі, творчыя ініцыятывы культурных дзеячаў краіны. Днямі ў рамках прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы абмеркавалі тыя нацыянальныя мастацкія праекты, якія спрыяюць інтэграцыі розных культурных традыцый, умацаванню міжнацыянальных сувязяў і стварэнню платформы для дыялогу.

РАЗАМ — ДА 30-ГОДДЗЯ ІНСТЫТУТА ПРЭЗІДЭНЦТВА

Старшыня ГА «Беларускі саюз мастакоў» Глеб ОТЧЫК расказаў пра выставу «Разам. Да 30-годдзя інстытута прэзідэнцтва», якая нядаўна адкрылася ў мінскім Палацы мастацтваў. У экспазіцыю ўвайшлі працы каля 70 аўтараў, іх жанравая разнастайнасць вельмі вялікая: жывапіс на самую розную тэматыку, станковая і манументальная скульптура, кераміка, габелены. «Назва адлюстроўвае адзінства ў краіне. Разам з Прэзідэнтам, са сваёй краінай. У экспазіцыі прадстаўлены нашы дасягненні за 30 гадоў», — паведаміў спікер.

Варта адзначыць, што Беларускі саюз мастакоў адзіны на постсавецкай прасторы, які захаваў унітарнае прадпрыемства, работы скульптурнага і мастацкага камбінатаў.

«Калі нядаўна я расказваў пра гэта калегам з Казахстана, яны захапляліся, маўляў, вам добра, мы ўсё гэта даўно страцілі... Паглядзіце, колькі знакавых аб'ектаў рэалізавана за апошнія гады нашымі майстрамі: ад замкаў да залаў Нацыянальнай бібліятэкі, Палаца Незалежнасці, Вярхоўнага Суда, у тым ліку «Ала», «Трасцянец» і многія іншыя. Гэта ўсё зроблена пры падтрымцы дзяржавы», — падкрэсліў Глеб Отчык.

АЙЧЫННАЯ АРХІТЭКТУРА РАЗВІВАЕЦЦА

Паводле слоў **першага намесніка старшыні Беларускага саюза архітэктараў Вадзіма ДРАЖЫНА,** адным з самых яркіх мерапрыемстваў, якія праводзяцца Беларускім саюзам архітэктараў, з'яўляюцца нацыянальныя фестывалі архітэктуры. Шаснаццаты, які адбудзецца сёлета, ужо пачалі рыхтаваць.

Традыцыйна фестываль насычаны конкурсамі рознай тэхнікі, якія развіваюць практычную сферу дзейнасці, пачынаючы з дзіцячай і студэнцкай творчасці і заканчваючы практыкуючымі архітэктарамі. У праграму фестывалю ўвойдуць рэспубліканскі конкурс на найлепшы праект, пабудову і публікацыю, Мінскі міжнародны біенале маладых архітэктараў «Леанарда», рэспубліканскі конкурс дыпломных праектаў выпускнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, рэспубліканскі мастацкі конкурс дзіцячай творчасці «Архітэктура роднага краю». У яго рамках пройдуць і мерапрыемствы, прымеркаваныя да 80-годдзя Вялікай Перамогі. Персанальныя тэматычныя выставы, мастацкія і сумесныя з іншымі кірункамі мастацкай творчасці, конкурсы па эстэтыцы жыцця чалавека.

КОСМАС НАШ!

У апошнія гады музей-запаведнік Юрыя Гагарына таксама актыўна ўдзельнічаў у міжнародных праектах на тэрыторыі Беларусі. Аб гэтым падрабязна расказала **куратар міжнародных выставачных праектаў Федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай установы культуры «Аб'яднаны мемарыяльны музей-запаведнік Ю. А. Гагарына» Алена ГАГАРЫНА.**

«Тэма космасу аб'ядноўвае, яна ўсёабдымная і вельмі актуальная. Актуальная ў розных аспектах: палітычным, сацыяльным, культурным. Паміж Беларуссю і Расіяй за гэты час было рэалізавана даволі шмат праектаў, звязаных з космасам. Пачалі з таго, што крыху больш за два гады таму арганізавалі выставу народнага мастака, скульптара Беларусі Івана Міско на радзіме першага ў свеце касманаўта Юрыя Гагарына. Яна называлася «Космас І. Я. Міско». На гэтым не спыніліся. Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Беларусі ў Мінску з удзелам музея-запаведніка Юрыя Гагарына арганізаваў выставу пад назвай «Чакайце нас, зоркі». У 2023 годзе ў Мінску прайшоў першы беларуска-расійскі музейны форум. Ён адкрыўся выставай, прысвечанай Юрыю Гагарыну. Таксама на тэрыторыі мінскага аэраклуба адкрыўся павільён «Космас» — першы і адзіны на тэрыторыі Беларусі. Я пералічыла самыя яркія мерапрыемствы, якія мы сумесна правялі. Гаварыць пра іх можна шмат».

Дарэчы, на выставе «Мая Беларусь» таксама прадстаўлена тэма космасу. Спадзяёмся, яго асваенне і далей будзе знаходзіць адлюстраванне ў розных культурных аб'ектах і мерапрыемствах.

СУЧАСНАЕ МАСТАЦТВА АБ'ЯДНОЎВАЕ

Лаўрэат Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва, член ГА «Беларускі саюз мастакоў» Усевалад ШВАЙБА расказаў пра дзейнасць Саюза і яго ўнёсак у папулярызацыю сучаснага беларускага мастацтва. «Дзякуючы нашаму Саюзу было ажыццёўлена шмат нацыянальных праектаў. Хачу згадаць таксама міжнародны гуманітарны праект «Мінская ініцыятыва», паўдзельнічаць у якім у 2021 годзе запрасілі мяне і яшчэ некалькіх беларускіх і расійскіх мастакоў. У рамках гэтага праекта стартавала мастацкая мультымедыйная акцыя «Масты». Яны і сталі яе лейтматывам. Масты — быццам аб'яднанне дзяржаў і нацый, людзей цалкам», — падкрэсліў спікер.

ТВОРЧАСЦЬ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі Беларусі з'яўляецца ініцыятарам і арганізатарам многіх рэспубліканскіх і міжнародных праектаў, якія аказваюць значны ўплыў на фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму ў дзяцей і падлеткаў.

«Намі створана асаблівая сістэма работы — конкурсная. У ёй бяруць удзел усе ўстановы дадатковай адукацыі і не толькі. На працягу шэрагу гадоў мы рэалізуем велізарны рэспубліканскі культурна-адукацыйны праект «Беларускае народнае мастацтва і дзеці». Туды ўключаны і рэспубліканскія конкурсы праектна-даследчай дзейнасці навучэнцаў, такія як «Нашчадкі традыцый». Яшчэ адзін цікавы конкурс — «Добры дзень, свет». Маштабнасць гэтага праекта дзівіць — больш за 150 тысяч таленавітых, адораных дзяцей бяруць у ім удзел», — звярнула ўвагу **намеснік дырэктара УА «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Ганна АВЕРЫНА.**

Яна ВАЛАСАЧ.
Фота Ларысы ЦІМОШЫК.

Надвор'е на заўтра

МІНСК 760 мм рт.сл. -1..+1°С +1..+2°С

ВІЦЕБСК 762 мм рт.сл. -1..+1°С 0..+2°С

МАГІЛЁЎ 762 мм рт.сл. 0..+1°С +1..+2°С

ГОМЕЛЬ 765 мм рт.сл. 0..+2°С 0..+2°С

ГРОДНА 758 мм рт.сл. -1..+1°С 0..+1°С

БРЭСТ 759 мм рт.сл. -1..+1°С +1..+3°С

Паводле даных Белгідрамета

...у суседзяў

МАСКВА -3..-1°С

С.-ПЕЦЯРБУРГ +1..+3°С

Месяц

Апошняя чвэрць 21.01-28.01. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Геамагнітныя ўзрушэнні

22 гадз. 01 гадз. 04 гадз. 07 гадз. 10 гадз. 13 гадз. 16 гадз. 19 гадз.

Абазначэнні:
— няма прыметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

22 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

1861 год — нарадзіўся (г. Магілёў) Уладзімір Піліпавіч Горын-Галкін, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Расіі, філосаф-марксіст. У 1882 годзе за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў выключаны з Харкаўскага ветэрынарнага інстытута. Стварыў нарадавольскія гурткі ў Сімферопалі, Адэсе. У 1887 годзе быў арыштаваны і сасланы на дзесяць гадоў у Верхаянск. Удзельнік Сібірскага сацыял-дэмакратычнага саюза, член Саратаўскага камітэта РСДРП, працаваў у сацыял-дэмакратычных арганізацыях Растова-на-Доне, Баку, Тыфліса, Кутаісі. Супрацоўнічаў з газетай «Искра». Дэлегат II з'езда РСДРП (1903), бальшавік. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Кастрычніцкага ўзброенага паўстання. Адзін з арганізатараў Народнага камітэта замежных спраў РСФСР. З 1918 года быў на ваенна-палітычнай і навукова-педагагічнай рабоце.

1906 год — нарадзіўся (г. Мінск) Андрэй Александровіч, беларускі паэт, празаік, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Адзін з арганізатараў літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У 1929—1931 гадах — намеснік дырэктара Белдзяржкіно, у 1934—1937-м — намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. Аўтар паэтычных зборнікаў «Па беларускай маставой», «Празалоць», «Фабрыка смерці» і інш.

У свеце

1506 год — Папа Юлій II запрашае на службу ў Ватыкан швейцарскіх гвардзейцаў, якія з таго часу ахоўваюць папскую рэзідэнцыю.

1788 год — нарадзіўся лорд Байран, англійскі паэт-рамантык. Паэмы Байрана больш аўтабіяграфічныя, чым сачыненні іншых англійскіх рамантыкаў. Ён вастрэй за многіх адчуваў безнадзейную неадпаведнасць рамантычных ідэалаў і рэчаіснасці...

1927 год — адбыўся першы прамы радыёрэпартаж з футбольнага матча паміж «Арсеналам» і «Шэфілд Юнайтэд» у Лондане.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 12 781. Індэкс 63850. Зак. № 85. Нумар падпісаны ў 19.30 21 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12